ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры
Гродзенскага аблвыканкама
А.В.Клімовіч
9 студзеня 2024 г.

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі
і правядзення VI адкрытага абласнога
фестывалю гульні «Карнавал весялосці»

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення VI адкрытага абласнога фестывалю гульні “Карнавал весялосці” (далей – Фестываль).

2. Мэтамі і задачамі Фестывалю з’яўляюцца: папулярызацыя і актывізацыя гульнёвага жанру, павышэнне прафесійнага ўзроўню і выканальніцкага майстэрства культарганізатараў, вядучых сюжэтна-забаўляльных праграм; адраджэнне і развіццё традыцыйных народных гульняў, стварэнне новых гульнёва-забаўляльных праграм і далейшае выкарыстанне іх у сучасных мерапрыемствах; садзейнічанне выяўленню, вывучэнню і распаўсюджванню разнастайных форм гульнёвага жанру, далучэнню насельніцтва да розных форм дасугавай дзейнасці, абагульненню існуючага вопыту і яго ўкараненню ў практыку клубнай работы.

3. Арганізатарамі Фестывалю з’яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, сектар культуры Воранаўскага райвыканкама.

4. Для кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем Фестывалю ствараецца арганізацыйны камітэт (далей – аргкамітэт), які фарміруецца з прадстаўнікоў дзяржаўных органаў і зацікаўленых арганізацый (дадатак 1).

5. Фестываль праводзіцца 1 раз у 3 гады.

6. У 2024 годзе Фестываль адбудзецца 14 верасня ў г.п. Воранава.

7. У выпадку пераносу тэрмінаў правядзення Фестывалю ці яго адмены па аб’ектыўных прычынах удзельнікі, якія даслалі заяўкі, будуць паведамлены індывідуальна.

8. Праграма Фестывалю прадугледжвае тэатралізаванае шэсце, урачыстае адкрыццё, конкурсныя прагляды, падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне прызамі і дыпломамі ў рамках.

9. У Фестывалі прымаюць удзел: народныя і ўзорныя тэатры гульні, арганізатары вольнага часу ўстаноў культуры і адукацыі Гродзенскай вобласці.

10. Па рашэнні аргкамітэта на Фестываль могуць быць запрошаны творчыя калектывы з іншых абласцей Рэспублікі Беларусь і іншых краін.

11. На Фестываль прадстаўляюцца: анімацыйныя, гульнёва-пазнавальныя, сюжэтна-забаўляльныя, тэматычныя, фальклорныя, спартыўныя, гумарыстычныя праграмы для розных узроставых катэгорый насельніцтва.

12. Працягласць кожнай сюжэтна-гульнёвай праграмы не павінна перавышаць 20 хвілін.

13. Па выніках Фестывалю журы (дадатак 2) вызначае лаўрэатаў (I, II, III ступеняў) у кожнай з дзвюх узроставых катэгорый: дзіцячая (да 15 гадоў уключна), дарослая (ад 16 гадоў і болей), і ўзнагароджвае пераможцаў дыпломамі ў рамках і прызамі.

14. Дадаткова журы ўзнагароджвае пераможцаў дыпломамі ў рамках і спецыяльнымі прызамі:
- “За крэатыўнасць і наватарства вядзення праграмы”;
- “За прапаганду беларускай народнай гульні”;
- “За лепшае рэжысёрскае вырашэнне гульнёвай праграмы”;
- “За прадстаўленне праграмы, пабудаванай на рэгіянальным матэрыяле”;
- “За лепшую аўтарскую праграму”;
- “За лепшую праграму для моладзі”;
- “За цікавае ўвасабленне абрадавай дзеі ў гульнёвай праграме”;
- “Самы артыстычны аніматар”.

15. Астатнія ўдзельнікі Фестывалю атрымліваюць дыпломы за ўдзел у Фестывалі.

16. Пры падвядзенні вынікаў Фестывалю журы карыстаецца наступнымі крытэрыямі: сцэнічная культура і ўзровень выканальніцкага майстэрства; выкарыстанне сучаснага і традыцыйнага мясцовага матэрыялу; мастацкі ўзровень сцэнарнага матэрыялу; артыстызм, арыгінальнасць выканання.

17. Журы пакідае за сабой права аб’ядноўваць, або ўводзіць дадатковыя намінацыі, не прысвойваць месцы, вызначаць дадатковыя спецыяльныя дыпломы і прызы ў межах выдзеленага прызавога фонду Фестывалю.

18. Рашэнне членаў журы па вынікам Фестывалю фіксуецца ў пратаколе (падпісваюць усе члены журы), які размяшчаецца на афіцыйным сайце ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” на працягу да 10 каляндарных дзён з моманту правядзення Фестывалю.

19. Рашэнне журы з’яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

20. Для ўдзелу ў Фестывалі неабходна даслаць заяўку (дадатак 3), сцэнарый конкурснай гульнёвай праграмы **да 5 жніўня 2024 года** з

пазнакай "Карнавал весялосці" па адрасе: 230025, г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці", кантактны тэлефон: +375 152 623799, тэл/факс: +375 152 623787; e-mail: info@gromc.by.

21. Фінансаванне Фестывалю ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" на цэнтралізаваныя мерапрыемствы.

22. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: аплата працы вядучых, харэографа, прызы, спецыяльныя прызы, дыпломы, рамкі для дыпломаў.

23. Для фінансавання Фестывалю могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

24. Аргкамітэт пакідае за сабой права ўносіць змены ў дадзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення, а таксама перанос даты правядзення Фестывалю (у іншыя тэрміны).

25. Арганізатары Фестывалю захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў калектываў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення VI адкрытага абласнога фестывалю гульні "Карнавал весялосці"

## СКЛАД АРГКАМІТЭТА
VI адкрытага абласнога фестывалю гульні "Карнавал весялосці"

| | |
|---|---|
| Клімовіч А.В. | начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня аргкамітэта*; |
| Захарчук Д.І. | старшыня Воранаўскага райвыканкама, *сустаршыня аргкамітэта*; |
| Карповіч А.А. | намеснік старшыні Воранаўскага райвыканкама, *намеснік старшыні аргкамітэта*; |
| Гагарын Г.М. | загадчык сектара культуры Воранаўскага райвыканкама; |
| Камінская І.В. | дырэктар ДУК "Воранаўскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці"; |
| Крывіцкая С.В. | вядучы метадыст ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"; |
| Люленка В.В. | начальнік аддзела адукацыі Воранаўскага райвыканкама; |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" |

Дадатак 2
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення VI адкрытага абласнога фестывалю гульні "Карнавал весялосці"

## СКЛАД ЖУРЫ
VI адкрытага абласнога фестывалю гульні "Карнавал весялосці"

| | |
|---|---|
| Комар Л.П. | выкладчык цыклавой камісіі "арганізатар культурна-дасугавай дзейнасці" УА "Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў", *старшыня журы*; |
| Куратчык С.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *намеснік старшыні журы*; |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных установ упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Барбаровіч А.М. | галоўны спецыяліст сектара культуры Воранаўскага райвыканкама; |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" |

Дадатак 3
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення VI адкрытага абласнога фестывалю гульні “Карнавал весялосці”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік (загадчык) аддзела (сектарам) культуры гар(рай)выканкама
“___” _____________ 2024 г.

# ЗАЯЎКА

на ўдзел у VI адкрытым абласным фестывалі гульні “Карнавал весялосці”

1. Поўная назва калектыву і базавая ўстанова дзейнасці калектыву_______
_______________________________________________________________
2. Узроставая катэгорыя (дзіцячая, дарослая) ______________________
3. Назва праграмы _______________________________________________
4. Намінацыя ___________________________________________________
5. Працягласць праграмы _________________________________________
6. Мастацкі кіраўнік калектыву ці асобнага выканаўцы_______________
_______________________________________________________________
7. Гукавы носьбіт ________________________________________________
8. Тэхнічны райдар _______________________________________________
9. Кантактны тэлефон _____________________________________________

Кіраўнік базавай установы _____________________
(подпіс)

Заяўкі на ўдзел у фестывалі дасылаць да **5 жніўня 2024 года** на адрас: 230025, г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”, e-mail: info@gromc.by з пазнакай фестываль “Карнавал весялосці”. Кантактныя тэлефоны ў г. Гродна: +375 152 623799, тэл/факс +375 152 623787.